**Беларускае аб'яднанне ў Швейцарыі**
**Belarussische Vereinigung in der Schweiz**
**Belarusian Association in Switzerland**

Huebwiesenstr. 31 | CH-8954 Geroldswil | Schweiz
www.**belswiss**.org | facebook.com/**belswiss**
info@belswiss.org | +41 79 938 82 15
IBAN: **CH10 0900 0000 6055 0578 2**



Шаноўныя сябры! **Шчыра запрашаем** вас на

# ГУКАННЕ ВЯСНЫ

Будзем **праводзіць Зіму і сустракаць Вясну** — з песнямі ды скокамі, з гульнямі ды забавамі, з карагодамі ды вогнішчам, з гарачай гарбатай ды з блінамі з полымя, з жару!

Вас чакае ўтульная **атмасфера**, смачная **ежа**, насычаная **праграма** для дарослых і дзяцей, практычная **інфраструктура** і шмат **уражанняў**!

Адмыслова на гэтае свята мы чакаем **спецыяльных гасцей з Беларусі:**

фолк-калектыў **«ЖАВАРОНАЧКІ»**
з праграмай **«УЦЯКАЛА ЗІМА АД ВЯСНЫ»**

**Прыходзьце самі і запрашайце сваіх сяброў і знаёмых!**
Будзе весела, цікава, шматнацыянальна і смачна!

***«Нараджэнне новага магчыма толькі праз адміранне старога...»***

## Дата і час

Субота, **11 сакавіка** 2017
Пачатак а **12:00**, канец «афіцыйнай» праграмы а **17:00**

## Фармат мерапрыемства

**12:00** Кароткі экскурс ў старадаўні беларускі абрад «Гуканне Вясны»
**12:30** Нацыянальныя беларускія стравы і напоі *
**13:30** Спевы, танцы, гульні для дзяцей і дарослых
**15:00** Спальванне пудзіла Зімы, карагоды
**15:30** Падвячорак, адпачынак
**16:00** Майстар-класы, квэсты для дзяцей і дарослых
**17:00** Закрыццё мерапрыемства

*** Стравы і напоі:**

- Традыцыйна-гістарычнае: бліны, шкваркі
- Альтэрнатыўна-смачнае: шашлык
- Вяскова-агароднае: капуста, баклажаны, агуркі, памідоры
- Закусачна-звычайнае: хлебцы, храбусцяшкі
- Сакавіта-фруктовае: яблыкі, грушы
- Смагаспаталяючае: вада, сокі, квас, піва, віно, гарэлка

**Працоўная мова** — беларуская (з паслядоўным перакладам на рускую, нямецкую, ангельскую, імравізацыйна-пальцавую і, па жаданні, на іншыя).

## Фінансы

Унёсак удзельніка — **35** шв. франкаў.
Для зарэгістраваных сябраў Аб'яднання — **20** шв. франкаў.
Дзеці/падлеткі да 16 гадоў, а таксама ганаровыя госці — **бясплатна**.

Порцыя шашлыку (250 г) — **10** шв. франкаў. (Калі ласка, **замаўляйце загадзя!**)

У кошт унёску уваходзіць амаль што** усё **(!)** — інфраструктура, праграма, ежа**, напоі!
(** Шашлык аплачваецца асобна.)

## Рэгістрацыя

Калі ласка, **абавязкова паведаміце нам** (гл. раздзел «Кантакты» ніжэй) аб сваім жаданні прыняць удзел у мерапрыемстве, вызначце колькасць і катэгорыю (гл. вышэй) ўдзельнікаў і, калі трэба, колькасць порцый шашлыку. **Дзякуй загадзя!**

## Кантакты

Беларускае аб'яднанне ў Швейцарыі
**info@belswiss.org**
facebook.com/**belswiss**
**+41 79 938 82 15**

## Месца правядзення

Царкоўны свіран «**Christkatholische Pfarrschüre**» у вёсцы Магдэн (**Magden**, Kirchweg 15) у кантоне Ааргаў: https://map.search.ch/d/dm0mwqznm?pos=627965,264590&z=1024

Зручна дабрацца (гл. таксама мапу):

- на грамадскім транспарце: **аўтобус нумар 100** ад *Rheinfelden* ці *Gelterkinden* да *Magden, Unterdorf*, потым пяць хвілін пешкі па *Hauptstrasse* — *Juchstrasse* — *Chilewägli*
- аўтамабілем: **аўтабан-A3** Базэль–Цюрых, з'езд *Rheinfelden Ost*, накірунак *Magden*, у вёсцы — па навігатары альбо па паказальнікам на *Friedhof*

**Бясплатная паркоўка** непасрэдна побач з месцам правядзення мерапрыемства.

Дапаможам з арганізацыяй **сумесных аўтамабільных паездак** з іншых рэгіёнаў.

**Будзем радыя сустрэчы з вамі!**